Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!
15 лістапада 1931 г. № 2?4 (1533)
Чырвоная зьмена
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ

Украініць і замацаваць гасразрахунак, падняць ўнутры прамысловае накапленьне—такава задача (Сталін)

За ўзмацненьне марксысцка-ленінскага выхаваньня

Важнейшай умовай мобілізацыі мас комсамольцаў, рабочай і колгаснай моладзі на выкананьне чарговых задач партыі зьяўляецца марксысцка-ленінскае выхаваньне. Для ленінскага комсамолу гэта ўмова становіцца рашаючай і таму, што ён рэалізуе задачу ператварэньня КСМ у шматмільённую організацыю і прыняў у свае рады мільёны новых комсамольцаў. Выхаваньне новага папаўненьня—адважнейшая, першачарговая задача. Усе комсамольскія організацыі павінны былі надаць гэтаму пытаньню выключнае значэньне. У конкрэтных пастановах ЦК Усе ЛКСМ і ЛКСМБ асабліва падкрэсьліваецца, што марксысцка-ленінскае выхаваньне наогул і асабліва навічкоў зьяўляецца галоўнай задачай організацыі. Між тым, і гэта трэба з усёй яскравасьцю падкрэсьліць, ня гледзячы на многія указаньні і прыкладныя факты пастаноўкі марксысцка-ленінскага выхаваньня, цэлы рад організацый праяўляе яшчэ недастатковую ўвагу ў гэтай галіне (Жлобін, Любань), ёсьць і такія, што поўна ігнаруюць марксысцка-ленінскае выхаваньне (Магілеў, Слуцак, Расоны). Асноўным недахопам у сыстэме марксысцка-ленінскага выхаваньня неабходна лічыць тое, што комсамольскія камітэты і ячэйкі не разгарнулі сыстэматычную работу па ўцягненьню навічкоў у актыўную грамадзка-вытворчую працу. Неабходна падкрэсьліць, што хаця вялікая колькасьць навічкоў і ўцягнута ў соцыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва, аднак навічкі прымаюць яшчэ зусім слабы ўдзел у плянаваньні і рацыяналізацыі. Асабліва марудна паварачваецца сыстэма палітвучобы і марксысцка-ленінскага выхаваньня на вёсцы да цэнтральнай задачы—організацыйна-гаспадарчага замацаваньня колгасаў.

Аб чым усё гэта гаворыць. Аб тым, што ў рабоце на марксысцка-ленінскаму выхаваньню комсамольская організацыя мае сур'ёзныя недахопы.

Задача зараз у тым, каб неадкладна ахапіць навічкоў у першую чаргу сеткай палітвучобы і конкрэтнымі грамадзка-вытворчымі нагрузкамі.

Перабудаваць формы і мэтоды палітвучобы. Практычна перанесьці цэнтр вучобы ў брыгаду, у цэх. Праходжаньне тэмы трэба ўвязваць з практыкай, і зараз-жа прыступіць да падрыхтоўкі кадраў прапагандыстых праз раённыя курсы, сэмінары і г. д.

Пакончыць з абязьлічкай іураўнілаўкай у палітвучобе, дыфэрэнцыяваць зьмест і мэтоды занятках, дапасаваўшы іх да асаблівасьцяў кожнага прадпрыемства, да ўзросту слухачоў і іх агульнай падрыхтоўкі.

У грандыёзнай будоўлі штодня высоўваюцца новыя кадры, новы актыў. Узброіць гэтыя кадры тэорыяй марксызму ёсьць важнейшая баявая, неадкладная задача, ад якое залежыць якасьць нашай работы.

Вывучэньне рэволюцыйнай тэорыі, увязка яе з выкананьнем палітычна-гаспадарчых задач, жывыя формы і мэтоды вучобы—вось што забясьпечыць уздым марксысцка-ленінскага выхаваньня на ўзровень сучасных задач.

109% выкананьня прамфінплану і 3000 дэцыметраў хрому—

першыя трофэі брыгады Гольдблята

Гэтыя трофэі заваяваны ў барацьбе з абязьлічкай на прынцыпах гасразрахунку, у рэалізацыі 6 умоў Сталіна

Бліскучыя вынікі гасразрахунку

Маладзёжная брыгада з 14 лепшых ударнікаў закройнага цэху Менскай абутковай фабрыкі перайшла на гаспадарчы разрахунак. У дагаворы з адміністрацыяй цэху брыгада абавязалася поўнасьцю выконваць прамфінплян, даць добрую якасьць продукцыі, зьнішчыць прагулы і спазьненьні і прыняць самы актыўны ўдзел у грамадзкім жыцьці фабрыкі.

Старшы брыгадзір Э. Гольдблят—былы сакратар ячэйкі—2 разы прэміяваны за ўдарную работу: выконвае прамфінплян на 120 пр., ня мае ніводнага процанту браку. Комсамольцы Рубін, Голуб, Гурэвіч і інш. некалькі раз прэміяваны за ўдарную работу ў брыгадзе. 10 чалавек з брыгады атрымалі ўдарныя карткі.

За апошні час брыгада зэканоміла 3000 дэцыметраў хрому. Зараз, па ініцыятыве брыгады, у цэху організавана плянава-опэрацыйная група. У брыгадзе практыкуюцца дзесяцідзённыя вытворчыя нарады.

За кастрычнік брыгада выканала свой прамфінплян на 109 проц., за першую дэкаду лістапада—на 101 проц.

Зараз закройны цэх абкомсамолен, брыгада ўзяла шэфства над вучнёўскай брыгадай у цэху. Аб'яўлен штурм на ўключэньне ў сразены конвеер якасьці.

Удзельнікі брыгады зьяўляюцца не толькі ўдарнікамі на вытворчасьці, але і ўдарнікамі грамадзкага жыцьця заводу: выпускаюць штодзённік у цэху, актыўна ўдзельнічаюць у шматтыражках, усе ахоплены школаю.

Пераняць вопыт работы гэтай брыгады павінна кожная комсамольская ячэйка, кожны комсамолец.

Л. Фрыд.

5 брыгад пераведзены на гаспадарчы разрахунак

Комсамольцы чырвона-штандарнага заводу „Бальшавік" горача адгукнуліся на сталінскую пуцёўку выпушчаную ЦК ЛКСМБ. Маршруты пуцёўкі былі адразу распрацаваны ва ўсіх брыгадах і цэхавых ячэйках. За апошні час на заводзе організаваны 4 плянава-опэрацыйныя групы.

Лепшыя комсамольскія брыгады ў дэкаду у дэкаду перавыконваюць свой прамфінплян. Брыгада Стругалёў другога хромавага цэху пад кіраўніцтвам брыгадзіра Зінкоўскага дае самую добраякасную продукцыю ў цэху. Брыгада зьнізіла расцэнкі на 10 проц.

Комсамольцы навічкі з брыгады дубільшчыкаў і фарбоўшчыкаў паднялі пытаньне перад адміністрацыяй цэху аб пераводзе іхняй брыгады на гаспадарчы разрахунак.

У рабоце комсамольскай організацыі зьнішчана абязьлічка. Пачынаючы ад групы і брыгады і канчаючы ўсім калектывам кожны адказвае за даручаную яму працу.

За апошні час у сувязі з сталінскай пуцёўкай пераведзены каля 5 брыгад на гаспадарчы разрахунак.

Кутман.

На здымку: Маладзёжная гаспадарча-разрахунковая брыгада Гольдблята (Менская абутковая фабрыка).

Скончыць перавод на гасразрахунак да 1 студзеня 1932 г.

ВСНГ СССР прыняў пастанову, паводле якое тэрмін пераводу на гаспадарчы разрахунак усёй прамысловасьці канчаецца 1-га студзеня 1932 г.

Перайсьці на гаспадарчы разрахунак павінны: асноўныя дапаможныя цэхі, цэхі абслугоўваньня, а таксама пабочная вытворчасьць—аддзелы забясьпечаньня і збыту.

На гаспадарчы разрахунак не пераводзяцца аддзелы тэхнічнага кантролю, плянавыя аддзелы, бухгальтэрыя і г. д.

Устаноўлена абавязковае правіла, што на гаспадарчы разрахунак пасьля адпаведнай падрыхтоўкі пераводзяцца аднача͏сова ўсе цэхі і аддзелы заводакіраўніцтваў, узаемна зьвязаныя паміж сабою вытворча-гаспадарчымі адносінамі.

Пры пераводзе цэхаў на гаспадарчы разрахунак пастанова ВСНГ прапануе кіравацца наступнымі асноўнымі палажэньнямі: вытворчая дзейнасьць цэху вызначаецца нарадам—заказам, які даецца дырэктарам заводу. Заключэньне ўмовы паміж заводакіраўніцтвам і цэхамі забараняецца. У межах выкананьня плянавых заданьняў і дырэктыў заводакіраўніцтва, цэхі зьяўляюцца самастойнымі ўнутрызаводзкімі адзінкамі. Нарады—заказы распрацоўваюцца заводакіраўніцтвам на аснове прамфінпляну, пры абавязковым удзеле начальніка (загадчыка цэху). Нарад-заказ, зацьверджаны дырэктарам прадпрыемства, зьяўляецца абавязковым для цэху. Нормы выдаткаў, устаноўленыя ў нарадах-заказах, разглядаюцца, як гранічныя. Дасягнутая эконоія адносіцца на рахунак цэху.

Цэхам, якія пераводзяцца на гасразрахунак, надаюцца функцыі опэрацыйнага пляніраваньня, першапачатковага падліку і калькуляцыі продукцыі, нормаваньня працы і рацыяналізацыі. Для ажыцьцяўленьня адзначаных функцый, у цэхах ствараюцца адпаведныя цэхавыя апараты. Узаемаадносіны цэхаў паміж сабою і з пераведзенымі на гасразрахунак аддзеламі вызначаюцца цэхавымі ўмовамі, якія заключаюцца ня менш чым на квартал.

Умовы з іншымі прадпрыемствамі, а таксама ўсякага роду зносіны па заводзе могуць праводзіцца толькі заводакіраўніцтвам.

Для разрахунку па заключаных умовах устанаўляецца форма ўнутрызаводзкіх чэкаў і бягучых рахункаў цэхаў. Цэхі і іншыя ўнутрызаводзкія організацыі, пераведзеныя на гасразрахунак, сваіх рахункаў у банках ня маюць.

На найбольш буйных прадпрыемствах для ўнутрызаводзкіх разрахункаў можа ўстанаўлівацца сыстэмо контакорэнтаў. Вызначэньне цэхавай экономіі ці перавыдаткаў вызначаецца штомесяц. Частка экономіі, атрыманая цэхам, перадаецца ў яго распараджэньне.

Прэзыдыум ВСНГ СССР зьвярнуў увагу ўсіх гаспадарнікаў на тое: што правільнае і пасьлядоўнае ажыцьцяўленьне цэхавага гасразрахунку патрабуе самай інтэнсыўнай работы цэхавага адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсоналу па організацыі працы, ліквідацыі абязьлічкі ў абсталяваньні, сыравіне і матар'ялах, што стварае зацікаўленасьць рабочых мас у павышэньні вытворчасьці працы і ў палепшаньні якасьці продукцыі.

Максымальна загрузіць работай мялкі

Комсамол Шклоўшчыны ўключыўся ў месячнік. Выкарыстаем усе рэсурсы паліва, забясьпечым бесьперапынную работу сушыльных пунктаў

Мінула 4 дні, як распачаўся абвешчаны ЦК КП(б)Б месячнік перааправоўкі і загатоўкі ільнавалакна. Большасьць комсамольскіх організацый яшчэ не ўключылася у месячнік. Зараз трэба па-баявому выправіць прапушчанае, сконцэнтраваць сілы на разгортваньні першапачатковай апрацоўкі лёну, скласьці ўдарныя брыгады комсамольцаў і моладзі для мяцьця і трапкі, падрыхтаваць сушыльныя памяшканьні, на 100 проц. нагрузіць мяльныя машыны. узьняць продукцыйнасьць працы, украніць зьдзельшчыну, шырока разгарнуць соцспаборніцтва і ўдарніцтва, даць рашучы адпор кулаку, спажывецкім і месьніцкім тэндэнцыям.

Кожны колгас і комсамольская ячэйка абавязаны ў найкарацейшы тэрмін выканаць свае абавязацельствы перад дзяржавай.

Мобілізаваць масы на выкананьне дырэктыў партыі

Расоны. Колгас „Чырвоная зорка" ня выконвае свае абавязацельствы па здачы ільнавалакна дзяржаве. Першапачатковая перааправоўка лёну фактычна не распачата. Не падрыхтаваны памяшканьне над сушыльны пункт.

Пастанова ЦК КП(б)Б аб месячніку ільнавагатовак не абгаворана на сходзе комсамольскай ячэйкі сярод колгасьнікаў. Зусім не мобілізавана ўвага колгасьнікаў на ўдарнае праводзеньне першапачатковай апрацоўкі лёну. Машыны не адрамантаваны і ня маюць поўнай нагрузкі. Дрэнна організавана ільнаапрацоўка, не ўкаранена зьдзельшчына, ня створаны брыгады. Комсамольская ячэйка бязьдзейнічае.

Усё гэта сьведчыць аб тым, што кіруючыя раённыя організацыі не мобілізавалі ўвагу грамадзкасьці на хутчэйшае ажыцьцяўленьне дырэктывы партыі ад першапачатковай апрацоўкі лёну і здачы яго дзяржаве ў найкарацейшы тэрмін.

Л.

Аддаць пад суд крамніка Бабра

Колгасьнікі і аднаасобнікі вёскі Дзічы шырока разгарнулі першапачатковую апрацоўку лёну. Аднак, загатоўкі апрацаванага валакна ідуць дрэнна. Па с.-савеце здадзена ўсяго некалькі кілё. Асноўныя прычыны ў тым, што няма масава-палітычнай работы вакол загатовак, а таксама загатоўчыя організацыі працуюць з рук вон дрэнна.

Дудзіцкае спажывецкае таварыства зрывае загатоўкі. Крамнік гр. Бобр не адчыняе краму на 2 дні. Колгасьнікі і аднаасобнікі—беднякі і серадцякі, прывёзшы здаць ільнавалакно і застаўшы краму зачыненай, зьвяртаюцца дамоў.

Колгасьнікі некалькі раз прасілі праўленьне Дудзіцкага сельпо наладзіць рэгулярную прыёмку ільнавалакна, але праўленьне ніякіх мер ня ўжыла. Крамнік Бобр працягвае зрыў загатоўкі ільнавалакна.

К. Н.

Адвесьці ўдар

Своечасовая здача дзяржаве ільнавалакна мае выключна вялікую палітычна-гаспадарчую важнасьць. Колгасы і аднаасобны сэктар Веляшкоўскага сельсавету (Лёзьненскі раён) яшчэ ня прынялі ў гэтым ніякіх захадаў.

Яркі прыклад бязьдзейнасьці і безадказнасьці да апрацоўкі і здачы ільна надае комуна „Дзесяцігодзьдзе Кастрычніка", там яшчэ ня ўвесь лён зьняты са сьцелішча.

Праўленьне комуны нават і ня думае апрацоўваць лён, мяркуючы здаць яго дзяржаве трастой. Райколгассаюз ня кіруе ільнаапрацоўкай і загатоўкамі, не організаваў сушыльна-мяльных пунктаў.

Большая частка колгасаў сельсавету і комсамольскія ячэйкі пры колгасах стаяць у баку ад гэтай адказнай работы.

Прарыў у Веляшкоўскім сельсавеце павінен быць тэрмінова ліквідаваны.

Міхась Гузоўскі.

Кастрычніцкая рэволюцыя і барацьба за соцыялізм

З дакладу тав. В. Молатава на ўрачыстым сходзе Маскоўскага савету, прысьвечаным XIV гадавіне Кастрычніцкай рэволюцыі—6 лістапада

Да пытаньня аб суадносінах сіл соцыялізму і капіталізму

Чатырнаццаць год таму назад рабочая кляса нашай краіны скінула панаваньне памешчыкаў і капіталістаў і, ставшы на чале ўсёй масы працоўных, прыступіла да пабудовы новага, свабоднага жыцьця на асновах соцыялізму.

За гэтыя гады намі пройдзен труднейшы шлях барацьбы з варожымі клясавымі сіламі. Ня толькі ўнутры краіны клясавы вораг аказваў шалёнае супраціўленьне будаўніцтву соцыялізму. Гэта будаўніцтва было звязана з асаблівымі цяжкасьцямі ў моц таго, што СССР,—першая ў сьвеце рабочая дзяржава, як-бы сьціснута непрымірыма варожым яму знешнім капіталістычным абкружэньнем.

Ня гледзячы на ўсе гэтыя цяжкасьці, соцыялізм за гэтыя годы гіганцка прасунуўся наперад, за многім умацаваўшы свае пазыцыі. І таму на парозе пятнаццатага году Кастрычніцкай рэволюцыі мы маем права сьцьвярджаць, што існуюць дзьве асноўныя гістарычныя сілы—соцыялізм і капіталізм; барацьба паміж якімі і вызначае асноўная лінія сусьветнага разьвіцьця. Лініі разьвіцьця соцыялізму і капіталізму ідуць у проста процілеглым напрамку. Соцыялізм ідзе ўверх, на пад'ём. Капіталізм усё больш заблытваецца ў сваіх супярэчнасьцях і пад цяжарам сусьветнага крызісу трапіць адну пазыцыю за другою.

За пасьляваенны перыяд у радзе капіталістычных краін быў пэўны ўздым у прамысловым разьвіцьці. Эканамічны крызіс з кожным днём усё больш зводзе да нуля параўнальна-скромныя посьпехі, якія былі дасягнуты капіталістычнымі краінамі за гэты перыяд. Цяпер мы ўжо маем такое становішча, калі агульны ўзровень прамысловай вытворчасьці ў капіталістычных краінах усяго на некалькі процантаў вышэй даваеннага ўзроўню. Больш таго. У такой перадавой капіталістычнай краіне, як Нямеччына мы маем нават значна горшае становішча. Тут узровень прамысловай вытворчасьці у дадзены момант зьніжаецца да таго становішча, якое нямецкая прамысловасьць мела, прыкладна, трыццаць год таму назад.

Зусім іншае становішча ў нашай краіне, у краіне, дзе будуецца соцыялізм.

У СССР параўнаньне сучаснай прамысловай вытворчасьці з даваенным узроўнем дае зусім іншы малюнак. Тут у нас зараз мы маем такі ўзровень прамысловай вытворчасьці, які больш чым у два з паловай разы перавышае ўзровень прамысловай вытворчасьці да ваеннага часу. І да таго-ж ва ўсіх на вачох разгортваецца такое будаўніцтва ў галіне індустрыі, якое забясьпечвае з кожным годам усё больш далейшы рост прамысловай продукцыі.

У краінах капіталізму беспрацоўе дасягнула няўчуваных размераў. Тут армія беспрацоўных налічвае ўжо дзесяткі мільёнаў. Беспрацоўе не толькі не зьмяншаецца, але ахапляе ўсё новыя мільёны рабочых. Сотні тысяч і мільёны беспрацоўных даведзены да простага галадаваньня і да паўжабрацкага стану. У некаторых краінах беспрацоўе і поўбеспрацоўе ахапляе ўжо больш палову ўсёй масы рабочае клясы. Становішча беспрацоўных з кожным днём становіцца ўсё больш распачлівым.

У СССР ня існуе беспрацоўя. У краіне соцыялістычнага будаўніцтва новыя фабрыкі і заводы, адкрываюцца новыя прадпрыемствы-гіганты. Кадры занятых у прамысловасьці рабочых няўхільна растуць, і пры тым з кожным годам усё шпарчэй. У прамысловых раёнах ужо мы маем недахват рабочых.

У краінах капіталізму мільёны сялян перажываюць зараз выключна цяжкае становішча. Сусьветны крызіс і ідучае разам з ім скарачэньне прамысловай вытворчасьці, а значыць, і скарачэньне попыту на сельска-гаспадарчыя продукты, б'е па вёсцы, і асабліва па асноўнай сялянскай масе. Зруйнаваньне сялянскіх гаспадарак, з кожным днём павялічваецца колькасьць ..., а таксама палатакавага ярма, якое навалілася, адбываецца цяпер з асаблівай шпаркасьцю.

Капіталізм дажывае свой век. На зьмену яму ідзе новы соцыялізм. Факты сусьветнага разьвіцьця сьведчаць аб тым, што прадпасылкі для зьвяржэньня капіталізму ва ўсім сьвеце шпарка насьпяваюць. Гэтыя факты ўсё больш красамоўна гавораць аб тым, што Кастрычніцкая рэволюцыя была ня толькі вялікай рэволюцыяй рабочае клясы нашай краіны, але што Кастрычніцкая рэволюцыя зьяўляецца пачаткам міжнароднай соцыялістычнай рэволюцыі. Вялізарнейшае гістарычнае значэньне Кастрычніцкай рэволюцыі заключаецца ў тым, што яна адкрыла новую эпоху ў разьвіцьці ўсяго чалавецтва. Пройдзены шлях і новыя факты з кожным днём усё больш сьведчаць аб тым, што мы жывем у эпоху шпарка нарастаючай між народнай пролетарскай рэволюцыі, у эпоху набліжэньня краху ўсёй капіталістычнай сыстэмы, у эпоху набліжэньня поўнай перамогі соцыялізму.

2. Кастрычніцкая рэволюцыя і задачы бягучага моманту

Кастрычніцкая рэволюцыя мае сваю гісторыю.

Гэта гісторыя—гісторыя вялізарнейшых перамог. Галоўныя з гэтых перамог ляжаць па лініі канчатковага заваяваньня сялянскіх мас на бок пролетарыяту.

З гэтага пункту погляду асабліва важны два рашаючыя этапы ў разьвіцьці Кастрычніцкай рэволюцыі.

Першы з іх адносіцца да восені 1918 году, калі соцыялістычная рэволюцыя па-сапраўднаму шагнула з гораду ў вёску. І другі—да 1929 году, калі адбыўся нарэшце, канчатковы паварот да соцыялізму ў асноўнай сялянскай масы, у сераднякоў.

Гэтыя два этапы маюць рашаючае значэньне для справы соцыялізму ў нашай краіне. Гэтыя дзьве даты—1918 і 1929 гады—вехі перамог соцыялізму на самым адсталым і цяжкім гаспадарчым фронце, на фронце соцыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі.

У барацьбе соцыялістычных і капіталістычных элемэнтаў у нашай краіне соцыялізм атрымаў перамогу. На ленінскае пытаньне—„хто каго?“,—ці пераможа соцыялізм капіталістычныя элемэнты, ці наадварот, капіталістычныя элемэнты зломяць рост соцыялізму, мы маем ужо вычарпальны адказ. Рабочая кляса, апіраючыся на пераважную масу сялянства, аб'яднанага ў колгасы, атрымала перамогу над капіталістычнымі элемэнтамі. Тым самым справа соцыялізму ў нашай краіне поўнасьцю і канчаткова забясьпечана.

Яшчэ рана, вядома, гаварыць аб канчатковых выніках бягучага гаспадарчага году. Пакуль можна рабіць толькі папярэднія вывады. Але гэтыя апошнія ўжо даюць уяўленьне аб асноўных выніках 1931 г.

За апошнія месяцы мы маем значнае палепшаньне ў нашай прамысловасьці. Калі ў першыя месяцы бягучага году рад галін прамысловасьці знаходзіўся ў цяжкім становішчы, асабліва з прычыны значных недахопаў у рабоце чыгуначнага транспорту, дык у апошні час ёсьць палепшаньне на ўсёй лініі індустрыі.

Вытворчая програма, што выконваецца ў 1931 г. прамысловасьцю перавысіць тое, што намячалася для трэцяга году ў пяцігадовым пляне. Ужо цяпер можна з поўнай упэўненасьцю сьцьвярджаць, што ў бягучым годзе мы настолька далёка пасунемся наперад у разьвіцьці індустрыі, што ў наступным 1932 годзе мы зможам поўнасьцю скончыць выкананьне пяцігадовага пляну.

Мы не сумняваемся, што 1932 год будзе годам завяршэньня пяцігодкі, г. зн. скончэньня пяцігодкі за чатыры гады.


Да цяперашняга часу г. зн. толькі да канца трэцяга году пяцігодкі. мы ўжо, прыкладна, на тры чэцьверці пяцігодку ажыцьцявілі.

Пяцігодка намячала да канца 1933 г. колектывізацыю 20 проц. сялянскіх гаспадарак. Між тым ужо цяпер да канца трэцяга году пяцігодкі, колектывізавана—галоўным чынам у сельска-гаспадарчых арцелях—звыш 60 проц. сялянскіх гаспадарак. У разгортваньні саў аснага будаўніцтва мы таксама перавысілі заданьне пяцігодкі. Перабудова сельскай гаспадаркі на соцыялістычных падставах зрабіла зусім выключныя посьпехі за апошнія 2-3 гады. Усё гэта дае нам падставу сьцьвярджаць, што на працягу бягучага году колектывізацыя сялянскіх гаспадарак у Савецкім Саюзе ў асноўным будзе скончана.

Асобная месца ў нашай гаспадарчай рабоце займаюць пытаньні забясьпечаньня, пытаньні організацыі савецкага гандлю. Тут нашы посьпехі яшчэ зусім невыстарчальны. За палепшаньне гэтай справы мы павінны цяпер узяцца з асаблівай настойлівасьцю.

Організацыя гандлю зьвязана ня толькі з задачамі організацыі гандлёва-разьмеркавальнай сеткі непасрэдна ў горадзе і непасрэдна ў вёсцы, але і з устанаўленьнем цэлага ланцуга ўзаемаадносін паміж горадам і вёскай.

Партыя паставіла зараз пытаньні забясьпечаньня ў разрад найбольш актуальных сваіх задач. Бальшавікі, ідучы на чале рабочых і працоўных вёскі, павінны дабіцца ўжо ў бліжэйшы час



рашучага зруху ў справе організацыі савецкага гандлю.

Матар'яльныя магчымасьці для хуткага палепшаньня забясьпечаньня ў нас ёсьць. Гэтыя магчымасьці растуць з кожным днём.

Нашы задачы ў гэтай галіне, як і ў цэлым нашы задачы ў новых умовах работы прамысловасьці, даны ў тых указаньнях нашай партыі і яе Цэнтральнага Камітэту, якія шырока вядомы як „шэсьць указаньняў тав. Сталіна“.

3. Будаўніцтва соцыялізму і барацьба за мір

Сусьветны крызіс унёс значныя зьмены ў міжнародную абстаноўку. Усе супярэчнасьці капіталістычнай сыстэмы ў сілу крызісу яшчэ больш абвастрыліся, пры гэтым усё больш нарастае абвастрэньне міжнародных супярэчнасьцяй у лягеры імпэрыялізму. Гэта немінуча ўжо таму, што экономічны крызіс вядзе да значнага скарочаньня рынкаў збыту а гэта ў сваю чаргу сутыкае ілбамі капіталістычныя краіны. Зразумела, гэта таксама вядзе да абвастрэньня асноўнай сусьветнай супярэчнасьці —непрымірымай па сваёй прынцыповай аснове супярэчнасьці паміж лягерам імпэрыялізму і соцыялістычнай рэспублікай Саветаў. Праўда, за апошні час з боку кіраўнікоў буржуазных урадаў робіцца ўсё больш і больш дэклярацыйных заяў аб мірных імкненьнях і прыязных пачуцьцях. Сталі больш частымі паездкі дыплёматаў і недыплёматаў са сталіцы ў сталіцу для тайных і поўсакрэтных перагавораў. Але міралюбівыя дэклярацыі буржуазных міністраў ніколі і ні ў якай меры не перашкаджалі і не перашкаджаюць імпэрыялістычным інтэрвэнцыям і окупацыям тэрыторый чужых дзяржаў з боку паасобных, больш падрыхтаваных для гэтага капіталістычных дзяржаў.

Сусьветны экономічны крызіс абвастрае проблему барацьбы за новы перадзел сьвету і таму небясьпека новых імпэрыялістычных войн цяпер узрастае з вялікай шпаркасьцю. Усё больш павялічваецца няўстойлівасьць у разьвіцьці капіталістычных краін. Выкліканае крызісам абвастрэньне ўсіх супярэчнасьцяй капіталізму, асабліва ў сувязі з вялізарнай няроўнамернасьцю разьвіцьця капіталістычных дзяржаў, узмоцнена расхіствае асновы пасьляваенных міжнародных адносін, якія (асновы) яшчэ ўчора здаваліся многім устойлівымі.

Не ўпяршыню ідзе вазьня вакол пытаньняў аб пераглядзе вэрсальскага дагавору. Цяпер справы Вэрсалю трашчаць асабліва моцна. Ні аб якой устойлівасьці ў гэтых адносінах ужо ніхто не гаворыць. А між тым Вэрсаль быў асновай міжнародных узаемаадносін у пасьляваеннай Эўропе, дый ня толькі ў Эўропе.

Буйнейшая імпэрыялістычная дзяржава—Вялікабрытанія—перажывае ў сувязі з крызісам не малыя затрудненьні. Не гаворачы ўжо аб політычнай перагрупоўцы, якая адбываецца там, нельга прайсьці міма таго факту, што ангельская буржуазія ахвяравала сваім фунтам. Аднак, адмаўленьне ад цьвёрдага курсу фунта стэрлінгаў адбылося, ва ўсякім выпадку, не таму, што позыцыі ангельскай буржуазіі за апошні час узмацніліся. Паданьне фунта адбіва е значнае ўзмацненьне хістаньняў глебы на якой трымаецца імпэрыялістычная магутнасьць гэтай краіны. Але палегчыўшы сабе справу новага грабежніцтва працоўных (зьніжэньне зарплаты рабочых і інш.) і паставіўшы на пэўны час свой замежны гандаль у больш спрыяючыя ўмовы конкурэнцыі, капіталістычная Англія зусім яшчэ ня выйшла з затрудненьняў. Наадварот, паданьне фунта немінуча вядзе да абвастрэньня ўнутраных супярэчнасьцяй і да абвастрэньня адносін на арэне міжнароднай імпэрыялістычнай барацьбы.

Становішча ў другой магутнейшай капіталістычнай краіне—у ПАЗШ—таксама сьведчыць аб буйнейшых зьменах у капіталістычным лягеры.

Але капіталізм мае яшчэ ня мала верных служак у так званых „рабочых“ організацыях. Соцыял-дэмократыя пастаўляе „пану капіталу“ ня толькі аддавых лёкаяў, але і верных сабак. II Інтэрнацыянал зрабіўся галоўнай апорай імпэрыялізму ў рабочай клясе Соцыял-імпэрыялістыя ня страцілі свайго ўплыву ў некаторых праслойках рабочае клясы. З другога боку „соцыялізм“ паноў соцыялістых з II Інтэрнацыяналу ў некаторых выпадках спрыяў простай дыскрэдытацыі ў рабочых масах справы соцыялізму. Таму пытаньне аб адносінах да соцыял-дэмократыі зьяўляецца для комунізму, які змагаецца за масы, рашаючым пытаньнем.

Падпоры капіталістычных краін усё больш падмываюцца і гэта асабліва шпарка адбываецца ва ўмовах найглыбейшага крызісу, з другога боку, імена ў гэтых умовах нарастаючай экономічнай і політычнай няўстойлівасьці ў капіталістычных краінах павялічваюцца небясьпекі провокацый новых імпэрыялістычных інтэрвэнцый супроць СССР. Тым з большай сілай мы павінны працягваць нашу барацьбу за мір, барацьбу за забясьпечаньне далейшых мірных умоў будаўніцтва соцыялізму. Савецкі Саюз ня раз даведў і даводзіць усёй сваёй міжнароднай політыкай, што СССР зьяўляецца сапраўдным і па сутнасьці адзіным пасьлядоўным змагаром за справу міру.

Савецкі Саюз усямерна клапоціцца аб умацаваньні мірных адносін з іншымі краінамі. Усякія крокі ў гэты бок заўсёды сустракаюць з нашага боку актыўнае падтрыманьне. У гэтай сувязі зразумела значэньне, напрыклад, такіх крокаў, як нядаўнае падоўжаньне савецка-нямецкага дагавору. Мы павінны з асаблівым задавальненьнем адзначыць прыязны прыём які аказан народнаму камісару т. Літвінаву ў Турцыі, і той факт, што падоўжаньнем савецка-турэцкіх згод мы ўмацоўваем прыяцельскія адносіны абедзьвюх краін паміж сабой і спрыяем умацаваньню справы міру ў цэлым.

У асобным становішчы да апошняга часу знаходзіліся нашы адносіны з Францыяй, а таксама з Польшчай. Але за апошні час і тут намеціўся некаторы зрух к лепшаму.

Яшчэ ў 1926 годзе савецкі ўрад зрабіў польскаму ўраду прапанову аб заключэньні дагавору аб ненападзе Але на працягу цэлых 5 год мы ня мелі з боку польскага ўраду здавальняючага адказу. Зараз ёсьць паведамленьне, што міністр замежных спраў Залескі заявіў аб гатоўнасьці польскага ўраду падпісаць з СССР дагавор аб ненападзе. Наша жаданьне заключаецца толькі ў тым, каб гэтыя словы не засталіся словамі.

Для нашых адносін з Францыяй мае значэньне той факт, што як вядома, СССР і Францыяй ужо парафіраваны, г. зн падпісан у папярэднім парадку пакт аб ненападзе. З прычыны таго, што наша даўнейшая прапанова Францыі аб заключэньні такога дагавору і нядаўняе парафіраваньне, пакту аб ненападзе да гэтых часоў не атрымала канчатковага афармленьня, мы пакуль што ня можам вызваліцца ад пэўнага скэптыцызму ў гэтай справе.

Цяпер аб нашай позыцыі ў сувязі з падзеямі ў Манчжурыі. Можна падрабязна ня спыняцца на гэтым пытаньні, бо позыцыя Савецкага Саюзу ў даным пытаньні і без таго ўсяму сьвету вядома і ясна. Ужо па аднаму гэтаму яна ў корані адрозьніваецца ад позыцыі Лігі нацый.

Наша політыка няўмешваньня ў гэтыя справы выцякае з паважаньня міжнародных дагавароў, заключаных з Кітаем, з паважаньня суверэн... праў і незалежнасьці іншых дзяр... і з безумоўнага адмаўленьня полі... ваеннай окупацыі і інтэрвэнцыі. ...мі-б словамі і дыплёматычнымі ... мі ні прыкрывалася політыка ім... лістычных інтэрвэнцый, Савецкі С... ня можа не займаць у адносінах ... добных фактаў да канца адмоў... позыцыю. Іншыя адносіны несумя... ны з мірнай політыкай, якая пра... дзіцца СССР і з пасьлядоўнай аба... най Савецкім Саюзам інтарэсаў ... агульнага міру, Аб гэтым і было ... яўлена тав. Караханам прадстаў... японскага ўраду ў Маскве ў вы... пальнай форме.

Падзеі ў Кітаі паказваюць, што ім... рыялістычныя дзяржавы праводзяць ... пер падзел Кітаю. Пры гэтым ... апіраюцца: адна—на адну генэра... скую зграю, другая—на другую ... нэральскую зграю ў Кітаі, Політыку ... дзелу Кітаю яны бессаромна прыфар... ваюць і ўрачыста асьвятляюць разва... ваньнямі аб тым, што „Кітай зу... не краіна, а контынэнт“ (словы ф... цускай імпэрыялістычнай газэты „... бэртэ“). На падставе гэтага паны ... пэрыялістыя абвяшчаюць свабоду ... падараньня імпэрыялістычных сіл ... Кітаі, асабліва пры гэтым клапоцяц... ся аб стварэньні далёкаўсходняга пл... дарму супроць СССР.

Факты апошніх год у выстарча... най меры паказалі няздольнасьць ... міндану да барацьбы з імпэрыялізм... На справе паасобныя гоміндаўскія ... зграі зьяўляюцца ў тэй ці іншай ... ры агентурай замежных імпэрыя... тычных сіл. Усё, што было дэмок... тычнага ў Гоміндане, вышла аатут... Гоміндан ужо ў поўнай меры выяв... што барацьба яго адбываецца ўну... ры яго, прадстаўляе сабой бараць... паасобных генэральска-памешчыцк... і генэральска-буржуазных зграй а ... тыя зграі эксплёататараў утрымлі... юць уладу толькі дзякуючы таму, ш... апіраюцца на падтрыманьне тэй ... іншай імпэрыялістычнай дзяржавы, ... часамі і цэлай групы імпэрыялісты... ных дзяржаў.

Народныя масы Кітаю і перш ... ўсё кітайскі пролетарыят робяць ... гэтага свае вывады. Яны бачаць, ... шлях Гоміндану—ня шлях палепш... ня ўмоў жыцьця працоўных, ня ш... нацыянальнага адраджэньня Кіта... Зразумела, што кітайскі народ, р... чыя і сяляне Кітаю шукаюць сваёй ... рог.. Зразумела, што ў іх вачох уз... таеаўторытэт краіны Саветаў. І з кожн... днём для іх павінна станавіцца ... ясьней і ясьней, што толькі ... шлях, шлях барацьбы рускіх рабоч... і сялян, дае сапраўдны выхад, да ... лепшаньня жыцьця і нацыянальн... адраджэньня Кітаю.

Саветы, як органы рэволюцыйна-... мократычнай дыктатуры рабочых і ... лян, існуюць ужо ня першы год ... Кітаі, Яны маюць сваю вялікую бу... чыню. Толькі яны зьяўляюцца сапра... нымі органамі барацьбы з генэрал... памешчыкамі, кампрадорамі, з у... кітайскай буржуазіяй—барацьбы ... палепшаньне жыцьця народных ма... Толькі яны здольны давесьці да кан... і забясьпечыць посьпех у бараць... за вызваленьне Кітаю ад імпэрыялі... за яго незалежнасьць і нацыяна... нае аб'яднаньне. Толькі Саветы ... чале з рабочай клясай забясьпеча... перамогу кітайскаму народу.

Нашай задачай у галіне замежн... політыкі мы лічым далейшае пра... дзеньне пасьлядоўнай барацьбы ... мір, няўхільнае выкрыцьцё ўсіх пр... вакацый новых войн і спроб орга... зацыі нападу на СССР і разам з т... усямернае ўмацаваньне абароназдо... насьці нашай краіны і ўзьняцьце ... належную вышыню слаўнай Чырв... най арміі.

„Сакрэты“ перамог бальшавізму

Нашы перамогі, перамогі Кастрычніцкай рэволюцыі. сталі магчымымі толькі таму, што мы былі і застаемся праваднікамі ленінізму.

Але быць правадніком ленінізму азначае—весьці непрымірымую барацьбу з опортунізмам. Быць правадніком ленінізму, значыць—весьці барацьбу за ленінізм, супроць усіх і ўсякіх разнавіднасьцяй опортунізму.

Наша барацьба за ленінізм была накіравана супроць двух асноўных опортуністычных скажэньняў. У барацьбе з трацкісцкай „лявізной“ буржуазна-мяшчанскага тыпу—з аднаго боку, і з буржуазна-кулацкай ідэолёгіяй правага ўхілу—з другога, гартоўваліся рады нашай бальшавіцкай партыі, якая стаяла і стаіць на чале пераможнай Кастрычніцкай рэволюцыі.

З пункту погляду нашых унутраных задач, барацьба з правымі і з трацкістымі мае і цяпер актуальнейшае значэньне.

Правыя капітулявалі пасьля таго калі серадняцкая маса вёскі павярнула на шлях суцэльнай колектывізацыі і калі бядняцка-серадняцкія масы пад кіраўніцтвам нашай партыі перайшлі на практыцы да ажыцьцяўленьня політыкі ліквідацыі кулацтва як клясы.

Праваопортуністычная плынь у партыі разьбіта і ня існуе як асобная, самастойная сіла. Але праваопортуністычныя элемэнты ў практыцы наш... організацый далёка ня зжыты і дак... сябе адчуваць на кожным кро... Яны даюць сябе адчуваць і ў найбол... адкрытай форме—у выглядзе па... раньня кулацтву, а таксама ў выгл... дзе бездапаможнасьці некаторых р... ботнікаў у справе барацьбы з бурж... азнымі тэндэнцыямі ў колгасах і с... гасах. Праваопортуністычныя тэндэ... цыі даюць сябе адчуваць яшчэ ... рэдка і пры тым усюды, дзе ідзе б... рацьба за бальшавіцкія тэмпы соцы... лістычнага будаўніцтва і дзе ўпл... чужых клясавых элемэнтаў у наш... апараце адбіваецца на тых ці інш... праслойках бальшавіцкай партыі ... праяўляецца ў тых ці іншых форм... опортуністычнага супраціўлень... ажыцьцяўленьню праводзімых партыяй тэмпаў.

Але і барацьба з трацкізмам ... страціла свайго вялікага політычна... значэньня.

Праўда, трацкізм у яго адкрыты... выяўленьні ўжо поўнасьцю выраздз... ся ў контррэволюцыйную політы ну... групоўку. За „левымі“ фразамі тра... кістых цяпер ужо любы спэц і раб... чы пакажа меншавіцкае, а тысавец... кае нутро. Але з адрыжкамі трацкізму дагэтуль прыходзіцца сустракацца.

(ПРАЦЯГ ДАКЛАДУ НА 4-Й СТАР.)

Па ўдарнаму правесьці першую конфэрэнцыю ФЗВ

…падаць вышынямі выхаваньня фабзавучнікаў, …раўдаць задачу асноўнай формы падрыхтоўкі кадраў

…тра адчыняецца першая Менская гарадзкая конфэрэнцыя ФЗВ. …а па л…ку першая ў БССР конфэрэнцыя ФЗВ павінна па-бальшавіцку выраш…ыць задачы, якія пастаўлены ў пляне ле…ра…оты. Не…ха прагледзець і па-бальшавіцку выправіць мэтоды падрыхтоўкі …афікаваных кадраў, на якіх асаб…іва зараз прад'яўляе рахунак …кае разьвіцьцё і соцыялістычная рэконструкцыя народнай гаспа…

…з Менскай конфэрэнцыяй ФЗВ павінны пасьледваць конфэрэнцыі ін… …гарадоў БССР. Барацьба за бальшавіцкую падрыхтоўку кадраў …ароднай г…спадаркі і асабліва барацьба за падрыхтоўку кадраў …ыгуначнага транспорту павінна заняць адно з галоўнейшых месц …роце конфэрэнцыі ФЗВ.

У першых радох барацьбы за лепшы фабзавуч

…еская чыгуначная школа вуч…ў…ва зрабіла рашучы крок, …шы падрыхтоўку кваліфікава…х кадраў для транспорту, які …ы усё яшчэ застаецца вузкім …м у сыстэме ўсяе народнае …спадаркі Савецкага саюзу.

…гуначная школа рыхтуе зараз …ваніфікаваных рабочых для пара…рамонтнага і вагоннага парку.

…нкурс школа ўступіла ў 26 …абычніка.

…ўсіх клясах, за выключэньнем …га набору, праведзены вытвор…нарады па …а заліву вытворчых …ў тэорэтычнага і вытворчага …аньня і зацьвярджаны вучэбны …афікі школы. Пляны даве… да кожнага вучня.

…гэтага боку вучні высунулі …устрэчны плян па [illegible]

…перад настаўніцка-інструк… …персаналам школы паўстала …дача: прыстасаваць найлепшым …ам навучальныя пляны да за… …а хутчэйшай падрых… кадраў чыгуначнага тран… …рту. Першыя крокі ў гэтым …

…б палепшыць навучаньне, …дзіць на вышэйшую ступень …заўчыя і вытворчыя працэсы, …пры школе створаны мэтадычныя …чыя камісіі, якія прыступілі …а вырашэньня мэтадыка-пэдагогічных задач.

…оцспаборніцтвам і ўдарніцтвам, …адамі ўдарнай вучобы і рабо… …а прадпрыемстве вучні ста… …ых клясаў ахоплены на 10… проц.

…рамя гэтага, школа выклікала …соцспаборніцтва Магілеўскую і Віц…скую школы ФЗВ і мяркуе …з…, на буксір адну з адсталых … іншых галін вытворчасьці.

…эхкамітэт па лініі профсаюзаў …рабы заключае ўмову на соцспа…орніцтва з цэхкамітэтам Смалея… …чыгуначнай школы вучнёў…

…омсамольскі колектыў школы …і ў цэхавыя ячэйкі ўзялі шэф… …ства над вучнямі школы новага …абору па выхаваньню і ўцягнень… …ю у комсамол.

…падарунак 14 гадавіне Кастры…ніцкай рэволюцыі, вучні пара… …вога цэху адрамантавалі паравоз і ўключыліся ў ліквідацыю прарыву ў паравозным парку. Сьлесары і сталяры—вагоньнікі ўключыліся ў дапамогу вагона-рамонтнаму заводу.

Амаль усе вучні і пераважная большасьць настаўніцка-інструктарскага пэрсоналу прынялі актыўны ўдзел у ліквідацыі прарыву ва ўборцы збожжа ў колгасах. Сумесна з рабочымі заводу „Полымя рэволюцыі" школа трымае шэфства над Забалоцкім сельсаветам Смалявіцкага раёну. У дні сьвята Кастрычніцкай рэволюцыі ў гэты сельсавет быў зроблен выезд для наладжваньня вечару, прысьвечанаму 14 гадавіне Кастрычніка.

П. Санковіч.

Комсамол—шэф усеабучу

ЯКАСЬЦЬ ВЫРАШАЕ

ПА-БАЛЬШАВІЦКУ ЎЗЯЦЦА ЗА РЭАЛІЗАЦЫЮ ДЫРЭКТЫЎ ПАРТЫІ АБ ШКОЛЕ

За зрыў навучальнай работы—да суровай адказнасьці

2 месяцы прашло з таго часу, як Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) у сваёй пастанове выразна акрэсьліў месца аб грамадзка-вытворчай працы вучняў. „Злучэньне навучаньня з вытворчай працай неабходна праводзіць на такой аснове, каб уся грамадзка-вытворчая праца вучняў была паднарадкавана навучальным і выхаваўчым мэтам школы". Ня гледзячы на гэтую, зусім недвухсэнсоўную ўстаноўку, у цэлым шэрагу раёнаў усё яшчэ не нанесен сакрушальны ўдар па ўсякіх „левацкіх" загібах, калі пад шыльдай „політэхнізацыі", „грамадзкай работы" творацца справы, якія нічога агульнага ня маюць з задачамі нашае школы і накіраваны фактычна на разбурэньне яе. Такі опортуністычны стан рэчаў мы маем у Менскім Белпэдтэхнікуме і школах Жлобінскага раёну.

Комсамольскія організацыі і ячэйкі павінны разгарнуць рашучую барацьбу з усялякімі праявамі гора-палітэхнізацыі, з усялякімі скажэньнямі дырэктыў партыі аб школе. Гэтая барацьба павінна разгортвацца ў першую чаргу шляхам шырокай популярызацыі апошніх пастаноў партыі аб сярэдняй і ніжэйшай школе.

Гэтай справай павінен заняцца прокурор

Стан рэчаў у Менскім Белпэдтэхнікуме прымушае біць трывогу.

Увесну г. г. паўтары м-цы студэнты займаліся „ліквідацыяй прарываў" у прыгарадным саўгасе „Вялікая Сьляпянка", 16 дзён верасьня студэнты працавалі на леса нарыхтоўках. Каля 30 проц. навучальнага часу страчана на усялякія „штурмы", „ліквідацыі прарываў".

На розных матывах студэнты зьнімаліся з вучэбных заняткаў і імі затыкаліся „прарывы", і гэтым самым тэхнікум ператвараўся ў крыніцу рабочай сілы. Нават пасьля таго, калі у акадэмічнай галіне агаліўся страшэнны прарыў—50 проц. студэнтаў з 1-га курсу перав**е**дзены на 2-гі з запазычанасьцю па здачы заданьняў,—кіраўніцтва „мобілізуе" студэнтаў на 3 дні на копку бульбы у той-жа саўгас „Сьляпянка". У час гэтых „мобілізацый" вытворчая праца не падпарадкавалася выхаваўчым мэтам школы, вучоба закідвалася на апошняе месца. Замест вызначаных 110 гадзін па грамадазнаўству на 1-м курсе скарыстана было толькі 30 гадзін.

Тэхнікум яшчэ ня мае дагавору з прадпрыемствамі. Студэнты 2-га курсу групы „Б" індустрыяльны практыкум прахо…зяць у тэхнікумаўскай саматужнай майстэрні, дзе займаюцца габляваньнем дошак з 4-х бакоў. Гэтым габляваньнем займаюцца студэнты дзень у дзень вось ужо на працягу цэлага м-цу.

Ураўнілаўка ў стыпэндыі, дрэнная пастаноўка акадэмічнай работы незадавальняючыя бытавыя ўмовы прывялі да 50 проц. адсеву студэнтаў.

Групком МБПТ не займаецца пытаньнем падвышэньня кваліфікацыі настаўнікаў. 3-ці курс павінен сваю програму закончыць да 1-га студзеня 32 году, але з-за адсутнасьці выкладчыкаў па дыямату і іншых прадметах, курс зрываецца.

Пастанова ЦК УсеКП(б) аб школе яшчэ не распрацавана на курсавых сходах студэнтаў, а ў колектыве ЛКСМБ пытаньне аб яе рэалізацыі нават ня ставілася. На агульна-студэнцкім сходзе па заслуханьню дакладу аб гэтай пастанове была вынесена рэзалюцыя, у якой нічога конкрэтнага не сказана аб рэалізацыі пастановы ва ўмовах тэхнікуму.

Менскі Гарком ЛКСМБ павінен неадкладна зацікавіцца станам спраў у комсамольскім колектыве тэхнікуму.

Галавацяпы і опортуністы з кіраўніцтва тэхнікуму, якія ігнаруюць пастанову партыі аб школе і гэтым самым фактычна разбураюць тэхнікум, павінны быць прыцягнуты да суровай адказнасьці.

Брыгадзір „Ч З" В. Кавалевіч.

Комсамолія „Варашылава" ўключылася ў соцспаборніцтва з комунараўцамі

У „НОЎКАХ" АДСУТНІЧАЕ ПАРТЫЙНА-КОМСАМОЛЬСКАЕ КІРАЎНІЦТВА ПЕРАВЫБАРАМІ ФЗМК

Перавыбары фабзаўмясцкомаў у 3-м, рашаючым годзе пяцігодкі п…вінны прайсьці пад знакам мобілізацыі рабочых мас на выкананьне і перавыкананьне вытворчых плянаў ва ўсіх галінах прамысловасьці.

Гэту адказную задачу не ўсьвядоміла партыйна-комсамольскае кіраўніцтва шклозаводу „Ноўка".

І толькі там, дзе перавыбарам ФЗМК надалі політычнае значэньне, там дабіліся значных посьпехаў у выкананьні промфінпляну (Віцебск панчошная фабрыка „Клара Цэткін").

Усе комсамольскія організацыі павінны на прыкладу комунараўцаў і варашылаўцаў шырока разгарнуць соцыялістычнае спаборніцтва у лепшым правядзеньні перавыбараў ФЗМК.

Паклясьці канец бязьдзейнасьці

Да 25-га лістапада, згодна пастанове ЦСПСБ, павінна закончыцца перавыбарчая кампанія фабзаўкома. Не гледзячы на гэта партыйна-комсамольскія і профэсыянальныя організацыі заводу „Ноўка" (Сураскі раён) не разгарнулі яшчэ масавай работы вакол перавыбараў ФЗМК, праведзеньня справаздачна-перавыбарчых сходаў, не надалі політычнай важнасьці гэтай кампаніі.

Да гэтага часу не праведзена растлумачальная праца ў цэхах, не складзены брыгады па праверцы працы фабзаўкому. Партыйна-комсамольскія організацыі заводу не ўразумелі таго, што задача перавыбарчай кампаніі ня толькі ў тым, каб пераабраць ФЗМК, але і ў тым, каб на аснове разгортваньня бальшавіцкай самакрытыкі дабіцца кароннага пералому ў галіне рэалізацыі прамовы т. Сталіна

Сталінскія 6 умоў не пакладзены ў аснову ўсёй вытворчай працы ФЗМК. У выніку—на кожным двары зараз безгаспадарчасьць. Узоры бязьдзейнасьці паказвае і комсамольская організацыя, якая да гэтага часу не абгаварыла кандыдатур у склад новага ФЗМК. Партколектыў ігнаруе пастанову сэкратарыяту ЦК КП(б)Б аб партківраўніцтве перавыбарамі ФЗМК.

Брыгадзір „Чырвонай Зьмены"
Каночык. Я.

Справаздачна-перавыбарчыя сходы далі сустрэчныя пляны

Яшчэ да апублікаваньня адозвы УсеЦСПС рабочыя і работніцы панчошнай фабрыкі „Клары Цэткін" (Віцебск) шырока разгарнулі масавую падрыхтоўчую работу да перавыбараў ФЗМК.

Прапрацоўка на цэхавых сходах кантрольных лічбаў 4-га кварталу спрыяла яшчэ большаму ўздыму вытворчага энтузіязму рабочых. 150 рабочых у адказ на адозву УсеЦСПС аб'явілі сябе ўдарнікамі на выкананьне і перавыкананьне промфінпляну і на лепшы ўдзел у справаздачна-перавыбарчай кампаніі фабзаўкому.

Ударніцкі рух рабочых выклікаў хвалю новых сустрэчных плянаў і норм выпрацоўкі. Матальны цэх даў сустрэчную норму па пражы № 32 у 33 кілёграмы, замест нормы у 31 кгр., па шоўку 12 кгр., замест нормы 9 кгр. Вязальны цэх па дамскіх панчохах высунуў сустрэчную норму у 27 дзесяткаў панчох, замест 23,7. З часу перавыбарчай кампаніі 300 рабочых уступілі ў члены саюзу, організавана 9 гаспадарча-разрахунковых брыгад.

Алесь Хваёвы

Комсамолія заводу „Варашылава" адказвае „комунараўцам"

Першая заводзкая комсамольская конфэрэнцыя заводу імя „Варашылава", абмеркаваўшы выклік на соцыялістычнае спаборніцтва у лепшым правядзеньні справаздачна-перавыбарчай кампаніі ФЗМК, зроблены „комунараўцамі" уключылася ў соцспаборніцтва, паставіўшы перад сабою наступныя конкрэтныя абавязкі:

1) Шырока разгарнуць масавую працу навакол справаздачна-перавыбарчай кампаніі ФЗМК.

2) За час справаздачна-перавыбарчай кампаніі ахапіць усіх комсамольцаў заводу і беспартыйную моладзь профэсыйным членствам, Практычна дапамагчы цэхкомам і заводзкаму камітэту у ахопе членствам усіх рабочых заводу.

3) За час справаздачна-перавыбарчай кампаніі поўнасьцю акомсамоліць капельны, сьлясарна-зборачны цэхі і матар'яльна-гаспадарчы аддзел, узьняўшы на належную вышыню працу па замацаваньню навічкоў у комсамоле праз уцягненьне іх у агульна-заводзкую вытворчую і грамадзкую працу.

4) Мы абавязваемся забясьпечыць 100 проц. яўку рабочых на перавыбарчыя сходы заўкому.

Прэзыдыум конфэрэнцыі.

Не дазволім ігнараваць дырэктывы партыі

(Рэйд жлобінскіх ударнікаў „Чырвонай Зьмены)

Усеабуч у раёне мае шэраг буйных прарываў. З 8-мі новых школ якія павінны былі ужо распачаць работу, пабудавана і працуе толькі адна. Забесьпячэньне школ з рук вон дрэннае: на 12 тысяч 860 вучняў адпушчана 860 пар абутку. Такім чынам, 12 тысяч дзяцей не забясьпечаны абуткам. Райспажыўсаюз ігнаруе пастановы партыі аб забесьпячэньні вучняў. Райінспэктарыят таксама ня прымаў рашучых захадаў да палепшаньня забесьпячэньня.

Політэхнізацыя у школах фактычна праваліваецца.

У пераважнай большасьці школ ігнаруюцца паказаньні партыі аб політэхнізацыі, адсутнічае барацьба за якасьць навучаньня. Асобныя школы політэхнізуюць вучняў тым, што мобілізуюць іх на усялякія кампаніі, як копка бульбы і г. д.

Комсамолія раёну, як шэф ўсеабучу, павінна несьці адказнасьць за такі стан рэчаў.

Ніводная ячэйка у раёне не распрацавала пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб школе. РК ЛКСМБ нічога ня ведае аб тым, як ячэйкі шэфствуюць над ўсеабучам.

Патрэбна неадкладна пакласьці канец ігнараваньню пастаноў партыі аб школе, прыцягнуць да адказнасьці галавацяпаў і опортуністых.

Ударная брыгада „ЧЗ":
Грышка Справядлівы.
Ярашэвіч С.,
Чаркушэвіч П.,
Савоська Ю.
Суверaў Б.

КАСТРЫЧНІЦКАЯ РЭВОЛЮЦЫЯ І БАРАЦЬБА ЗА СОЦЫЯЛІЗМ

З дакладу тав. В. Молатава на ўрачыстым сходзе Маскоўскага савету, прысьвечаным XIV гадавіне Кастрычніцкай рэвалюцыі—6 лістапада

(*Канец. Пачатак глядзі на 2 стар.*).

Сэрцавінай трацкізму было адмаўленьне магчымасьці перамогі соцыялізму ў нашай краіне. Але гэта нявер'е ў справу соцыялізму зьяўляецца ўрэшце, самай характэрнай рысай усякага опортунізму, усякай дробнабуржуазнай плыні.

З гэтым нявер'ем была непарыўна зьвязана паніка перад цяжкасьцямі клясавай барацьбы і ўпрыватнасьці па ніка перад наступленьнем кулацтва. Гэтай панікі перад клясавым ворагам пролетарыяту адпавядала і тактыка трацкістых.

Гэтая тактыка выцякала з таго трацкісцкага палажэньня што серадняк ня можа быць моцным саюзьнікам рабочае клясы ў барацьбе за соцыялізм. І саму трацкісцкая тактыка азначала на справе сьціраньне прынцыповай розьніцы паміж нашымі адносінамі да кулака і да серадняка і на справе вяла да пашырэньня на серадняка тэй-жа тактыкі, якую мы ўжывалі ў барацьбе з кулацтвам. Зразумела, што гэта політычная лінія ня мае нічога агульнага з ленінізмам і наскрозь яму варожая.

Ня гледзячы на тое, што толькі меншая частка сялян знаходзіцца зараз па-за колгасамі, пытатаньне аб заваяваньні на наш бок масы, што засталася адасобнікамі, ня зьнята з парадку дня. Мэтоды загаду і гвалту і цяпер настолькі-ж нецярпімы ў адносінах працоўных сялян, як яны былі нецярцімы і раней. Наша задача—весьці барацьбу за заваяваньне на бок колектывізацыі ўсёй масы працоўных сялян. Але гэту справу мы можам пабальшавіцку выканаць толькі ў тым выпадку, калі будзем весьці настойлівую і цярплівую растлумачальную работу ў масах аддаасобнікаў і асабліва, калі на справе здолеем усё лепш даводзіць перавагі работы ў колгасе. Толькі посьпехамі ў справе організацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня колгасаў і, значыцца, у справе сапраўднага павышэньня продукцыйнасьці працы колгасьнікаў мы забясьпечым поўную і канчатковую перамогу колектывізацыі.

Выключнае міжнароднае значэньне гэтай гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі заключаецца ў тым, што ленінскае тэорэтычнае палажэньне аб магчымасьці перамогі соцыялізму ў адной краіне паратварылася ў жывую сапраўднасьць, выклікаючы жывёльны трэпет у радох нашых ворагаў, усяляючы бадзёрасьць і ўпэўненасьць у канчатковую перамогу соцыялізму ў рабочай клясе ўсяго сьвету. (Воплескі).

І так, ленінізм перамагае. На аснове ленінізму ідзе згуртаваньне радоў рабочае клясы, а вакол яе—і ўсёй масы працоўных гораду і вёскі. У гэтым—„сакрэт" перамог бальшавікоў.

Паколькі мы ўжо забясьпечылі бясспрэчнае панаваньне соцыялістычных форм гаспадаркі ня толькі ў горадзе але і ў вёсцы, і паколькі гэта перамога зьяўляецца самым переканаўчым пацьвярджэньнем правільнасьці політыкі нашай ленінскай партыі,—насттолькі рашаючае ў далейшых посьпехах соцыялізму залежыць ад нас самых, ад нашай здольнасьці да організацыі мас, ад нашага ўменьня высунуць для гэтага патрэбныя кадры кіраўнікоў і забясьпечыць яшчэ большае вылучэньне гэтых кадраў у далейшым. Тым больш, што за гады рэволюцыі вырасла новае папаўненьне—пакаленьне моладзі і асабліва комсамольцаў з рэволюцыйнай закваскай.

Задачы падбору кіруючых кадраў соцыялістычнага будаўніцтва і вылучэньня ў рады кіраўнікоў новых і новых перадавікоў будаўнікоў з масы рабочых і сялян колгасьнікаў—і асобна з моладзі—павінны стаць у радзе нашых цэнтральных задач. На гэта трэба ўказаць тым больш, што нам яшчэ прыдзецца ня раз мець справу з контррэволюцыйнымі шкоднікамі ў дзяржапараце і весьці ўпартую і працяжную барацьбу з бюрократызмам, гнілой коснасьцю і да таго падобнымі балячкамі ва многіх нашых органах.

Узьняцьце культурнага узроўню мас будзе ў гэтых адносінах адыгрываць першачарговае значэньне. З гэтай справай зьвязана таксама ажыцьцяўленьне задачы аўладаньня тэхнікай і ўсёй сутнасьцю вытворчасьці і кіраўніцтва з боку нашых узрастаючых кадраў.

Комсамолія „Комунара" у перадавых колёнах СТАЛІНСКАГА ПАХОДУ

ПА „КОМУНАРУ" І ДРУКАРНІ ІМЯ „СТАЛІНА" РАЎНЯЙСЯ Ў ПАХОДЗЕ УСЯ КОМСАМОЛІЯ

Адказваем конкрэтнымі справамі

Сталінская пуцёўка зьяўляецца конкрэтнай формай барацьбы за рэалізацыю 6-ці ўказаньняў правадыра. Ленінскі комсамол вышаў на ўсесаюзны сталінскі комсамольскі паход.

Комсамольскі колектыў чырвонаштандарнага заводу „Комунар" разгарнуў сапраўды баявую работу па рэалізацыі сталінскіх маршрутаў і можа служыць прыкладам як трэба змагацца за ажыцьцяўленьне сталінскай пуцёўкі.

З чаго пачалі

Сталінская пуцёўка была распрацавана на ўсіх сходах цэхавых і брыгадных ячэек КСМ. Масавай растлумачальнай работай быў таксама ахоплены ўвесь рабочы колектыў. Абмеркаваўшы дэталёва маршруты ў кожным цэху і брыгадзе, кожная ячэйка і брыгада выбрала сабе асноўныя пытаньні, выходзячы з ўмоў цэху і брыгады. Бюро колектыву распрацавала заданьні для кожнай цэхавай і брыгаднай ячэйкі, якія ў сваю чаргу давялі пуцёўку да кожнага паасобнага комсамольца. Кожны комсамолец атрымаў конкрэтнае заданьне ў ажыцьцяўленьні ўказаньняў т. Сталіна.

Што зроблена

Асноўнымі задачамі зьявіліся: барацьба з ураўнілаўкай, пераход брыгад на гаспадарчы разрахунак, увядзеньне прэміяльна прогрэсыўнай зьдзельшчыны. Ячэйка сьлясарна-механічнага цэху перавяла 3 брыгады на гаспадарчы разрахунак, да кожнай прымацаваўшы групу, адказную за работу данай брыгады. На прэміяльна-прогрэсыўную зьдзельшчыну пераведзены сьвідравальныя і болтарэзныя варштаты.

Па такарным цэху

Ячэйка КСМ давяла прамфінплян да кожнай зьмены і варштату. Пераведзены на гаспадарчы разрахунак 47-ы і 8-ы варштаты, цісковыя сьвідравальныя пераведзены на прогрэсыўна-прэміяльную зьдзельшчыну.

Па ліцейным цэху

Пераведзены на гаспадарчы разрахунак формаўшчыкі бэтонных і сьвідравальных варштатаў. Увесь цэх пераведзены на прэміяльна-прогрэсыўную зьдзельшчыну, што зразу дало свае вынікі: прамфінплян у цэху выкананы на 121 проц.

Па кавальным цэху

Пераведзены 3 брыгады на прэміяльную зьдзельшчыну, ліквідавана ўраўнілаўка. Раней гэтыя брыгады выконвалі прамфінплян на 55 проц., пасьля пераводу на прэміяльна-прогрэсыўную зьдзельшчыну брыгада выканала прамфінплян на 88 пр. Пераводзяцца на гаспадарчы разрахунак адзін горан і нафтанка.

Ячэйка зьмены № 4 перавяла на гаспадарчы разрахунак комсамольскія варштаты Ражанскага і Бэргера.

Зараз ужо 50 проц. рабочых заводу пераведзены на прэміяльна-прогрэсыўную зьдзельшчыну і амаль усе комсамольскія брыгады і варштаты.

Вячэрні тэхнікум пры заводзе ставіць сваёй мэтай ліквідацыю тэхнічнай няпісьменнасьці. Тэхнікумам ахоплена 450 чал., астатнія вучацца ў політэхнікуме. Усе комсамольцы ахоплены тэхвучобай.

Рэалізацыя сталінскай пуцёўкі выклікала новыя хвалі рацыяналізатарскага руху. Комсамольцы сабралі 75 рацыяналізатарскіх прапаноў.

Гэта першыя крокі ў барацьбе комсамолу „Комунарка" за рэалізацыю сталінскай пуцёўкі. Ячэйкі комсамолу павінны ахапіць і такія маршруты, як палепшаньне культурна-бытавых умоў рабочых. Тут зроблена яшчэ мала.

Комсамольскі колектыў абавязан зараз сваім штодзённым кіраўніцтвам і праверкаю выкананьня забясьпечыць далейшую наступовую рэалізацыю сталінскай пуцёўкі.

Г.

Сталінцы рэалізуюць сталінскую пуцёўку

10 месяцаў таму назад комсамольскі колектыў друкарні імя Сталіна меў у сваіх радох 80 комсамольцаў.

Зараз колектыў налічвае каля 400 комсамольцаў, з якіх 90 проц.—навічкі.

Друкарня акомсамолена на 95 проц.

Змаганьне за шматмільённы комсамол колектыў увязаў з ўсёй барацьбою рабочага колектыву друкарні за прамфінплян.

80 проц. усіх комсамольцаў колектыву ахоплены соцыялістычным спаборніцтвам і ўдарніцтвам. Сталінская пуцёўка дала яшчэ большы штуршок у барацьбе комсамольскага колектыву за выкананьне гістарычнай прамовы т. Сталіна.

Маршруты пуцёўкі былі даведзены да кожнай групы і да кожнага комсамольца паасобку.

У друкарні організаваны 4 гаспадарча-разрахунковыя брыгады. У ФЗВ ліквідавана абязьліча над варштатамі і касамі. Увесь ФЗВ пераводзен на гаспадарчы разрахунак.

Комсамольскі лінотып даў сустрэчны прамфінплян на 24 проц. і перавыконвае яго на 6 проц.

Колектыў дабіўся не малых посьпехаў і у вучобе комсамольцаў. 6 тэхнічных гурткоў яднаюць 150 чал. У гэты лік не ўваходзяць комсамольцы ФЗВ і ШУМПУ.

Пры колектыве працуюць 9 сталых політгурткоў, у якіх займаецца больш 180 комсамольцаў. Большасьць слухачоў комсамольцы-навічкі.

Пры колектыве організаваны вайсковы габінэт. У вучпунктце займаецца 250 комсамольцаў.

Зараз ячэйкі ўключыліся ў справаздачна-перавыбарчую кампанію. Складзены комсамольскія самаправерачныя брыгады.

К фінішу—канцу 3-га рашаючага—комсамольскі колектыў пад кіраўніцтвам партколектыву даб'ецца стопроцантнай рэалізацыі сталінскай пуцёўкі.

Ымкін, Катноў.

ПА ТОЙ БОК МЯЖЫ

Генэрал Чан-Хай-пэн працягвае наступленьне

ТОКІЁ 13. „Сымбун-Рэнго" паведамляе з Мукдэну аб наступу генэрала Чай-Хай-пэна. Войскі Чан-Хай-пэна занялі Цзінсінчэнь (буйны горад на паўночны захад ад Тайнаў), адцісьнуўшы войскі генэрала Ма. На станцыі Фуляэрды, на лініі Кітайска-Усходняй чыгункі, ўчора была чутна кананада, якая сьведчыць аб буйных боях між войскамі генэрала Чай-Хая-пэна і Ма.

Стрэлам у жыв... забіты дэмонстрант рабо...

БЭРЛІН 13. Учора у Лю... пры разгоне дэмонстрацыі бе... цоўных поліцыя забіла стрэл... жывот рабочага шаўца Шутта.

Сяляне В. Сілезіі спынен... плацяжы па падат...

БЭРЛІН 13. На агульным с... сялян вёсак (Пэрнаў і Баўр... (В. Сілезія) прынята паста... спыненьні пляцяжоў па пада...

Компартыя правяла сотні сялянскіх сходаў

БЭРЛІН 13. 15-га лістапада компартыя Нямеччыны праводзіць усенямецкі сялянскі зьлёт. Компартыя правяла сотні сялянскіх сходаў, на якіх абгаворвалася комуністы... програма. У шмат якіх вёсках... раны камітэты дзейнічаньня, ... ністычныя ячэйкі.

Забастоўка беспрацоўных на прымусовых работах пашыраецца

БЭРЛІН 13. Забастоўка беспрацоўных, якія заняты на прымусовых грамадзкіх работах у Бэрліне пашыраецца. Учора баставала 5 тысяч чалавек. Працягваецца аналёгічная забастоўка ў В. Сілезіі

Праўда аб СС...

БЭРЛІН 13. Як паведамляю... Амстэрдаму, дэлегацыя галан... рабочых, што зьвярнулася з С... была спаткана на вакзале ... чым 2 тысячным натоўпам пра... ных, якія горача віталі дэлега... На мітынгу члены дэлегацыі ... крэсьлілі, што рачаіснасьць у С... перавысіла ўсе іх чаканьні.

Дэфіцыт бюджэту вырас да аграмаднай лічбы

ПАРЫЖ „Котыд'ен" на падставе дакладу аб бюджэце, які быў агалошаны на зьезьдзе радыкалаў, сьцьвярджае, што дэфіцыт па б... жэту вызначаецца аграмаднай ... бай у 6 мільярдаў франкаў.

Чаргавы процэс за „пропаганду комуністычных ідэй"

РЫМ. 11. У судзе распачаўся процэс 12 рабочых. Падсудных абвінавачваюць „у дачыненьні да компартыі, у пропагандзе комуністычных ідэй у 1930 г, шляхам ра... сюджваньня літаратуры і орга... цыі збору сродкаў на марк... чырвонай дапамогі".

Дэлегацыя саксонскіх комсамольцаў выехала ў Гомель і Віцебск

Учора дэлегацыя наведала сакратара ЦК ЛКСМБ т. Палякова. Адбылася падрабязная гутарка аб працы комсамолу Беларусі.

Увечары дэлегацыя, прабыўшы ў Менску на гадавіне Кастрычнікавай рэвалюцыі, выехала ў Віцебск (у ліку 5 асоб) і ў Гомель (у ліку 4 асоб).

З Гомелю і Віцебску дэлегацыя паедзе ў Ленінград і Маскву з мэтай азнаямленьня з сацыялістычным будаўніцтвам Савецкага Саюзу.

Друкарскія памылкі, якія патрабуюць безадкладнага разгаваньня

У № 263 "газэты „Чырвоная Зьмена" ад 14 лістапада па віне стэрэотыпнага аддзяленьня друкарні імя Сталіна на другой старонцы, у выніку няправільнай расстаноўкі фотоздымкаў, зроблены „памылкі": пад фотоздымкам загадчыка аддзелу тэхналёгіі Беларускай дасьледчай зональнай станцыі прафэсара Гуржы Р.С.—подпіс тав. Шапацы, пад фотоздымкам асыстэнта аддзелу тэхналёгіі т. Шапцы!—подпіс тав. Верабёва, пад фотоздымкам асьпіранта аддзелу тэхналёгіі дасьледчай станцыі т. Верабёва—подпіс прафэсара Гуржы Р. С.

Аднатыпныя памылкі для сте... тыпнага аддзяленьня друкарні Сталіна зьяўляюцца далёка не ... ключэньнем, а сыстэмай ... нях, няўважлівых адносін да ... забруджанай, без коленцыбару. ... цанкі на нашы просьбы, патр... ваньні ў гэтым напрамку сістэ... тыпным аддзяленьнем не выкон... юцца.

Мы патрабуем ад адміністр... друкарні імя Сталіна зараз-жа пр... нязь неабходныя меры да вы...

Рэдакц...

Нам. адказн. рэдактара С. АНІС...

16-га лістапада, а 7-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні клюбу мэталістых

АДБУДЗЕЦЦА

першая гарадзкая конфэрэнцыя ФЗВ

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Аб пэрспэктывах разьвіцьця прамысловасьці і падрыхтоўцы кваліфікаванай рабочай сілы;
2. Аб тэорэтычна-выхаваўчым навучаньні ў ФЗВ;
3. Аб стане грамадзка-політычнага выхаваньня ў школах ФЗВ.

Мандаты і запрашальныя білеты атрымаць у Гаркоме ЛКСМБ.

Культпроп Гаркому ЛКСМБ ФРУМКІНА.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38. Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэл. № 903. ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.

Друкарня імя тав. Сталіна.

Упаўнаважаны Галоўлітбелу № А—2522.